традиции). Особо сложными были, например, вопросы о конструкции дверей (железных петель или их аналогов при раскопках на памятниках раннего железного века не обнаружено) и крепления балок (железные гвозди также не использовались). Пришлось предположить, что двери заменяли шкуры животных, вывешенные в проёмах в несколько слоёв. А для крепления деревянных конструкций, возможно, использовались деревянные «гвозди» и плетёные конструкции.

Этот пример показывает, что сам процесс 3D-реконструкции весьма сложен и требует как научной основы, так и фантазии, которая позволяет на основе имеющихся данных и жизненного опыта заполнить недостающие элементы в материальной культуре того времени. Радует и другое: на боле поздних этапах существования города подобных белых пятен будет гораздо меньше.

**Заключение**. Таким образом, 3D-реконструкция исторических городов представляется перспективным направлением в современной истории. Это позволяет визуализировать историю и создать мультимедийный продукт, востребованный как в сфере туризма, так и в учебном процессе. Последнее особо важно, так как подобная форма предоставления исторической информации способна вызвать живой интерес к отечественной истории и краеведению, а значит стать основой для патриотического воспитания будущих поколений.

*Список литературы*


1. 3D реконструкции объектов историко-культурного наследия: компьютерное моделирование // Исторический факультет МГУ [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://hist.msu.ru/Labs/HisLab/ 3D/index.html. – Дата доступа 11.02.2014.
2. Археология 3D [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://3darchaeology.3dn.ru. – Дата доступа 11.02.2014.
3. Памяць: Гіст.-дакум. Хроніка Віцебска: У 2-х кн. Кн. 1-я / Рэд. Кал. Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2002. – 648 с.


## КЕРАМІКА ЯК КРЫНІЦА ПА ВЫВУЧЭННІ НЕАЛІТЫЧНЫХ СУПОЛЬНАСЦЯЎ БЕЛАРУСКАГА ПАНЯМОННЯ


*С.С. Юрэцкі*
*Мінск, Інстытут гісторыі НАН Беларусі*


Даследчыкі неаліту вылучаюць археалагічныя культуры, тыпы і групы помнікаў пераважна на падставе вывучэння керамікі. Менавіта яна застаецца галоўным паказчыкам, які дазваляе размежаваць неалітычныя комплексы на шматкультурных помніках. Сярод неалітычных старажытнасцяў кераміка вылучаецца сваёй найбольшай распрацаванасцю з крыніцазнаўчага і метадалагічнага пункту гледжання. Мэтазгодным з'яўляецца аналіз падыходаў археолагаў, якія яны выкарыстоўвалі пры вывучэнні неалітычнай керамікі рэгіёну. Далейшыя даследаванні ў дадзеным накірунку павінны прывесці да вырашэння найбольш істотных пытанняў, звязаных з неалітычнымі супольнасцямі на тэрыторыі Беларускага Панямоння.

**Матэрыял і метады.** Базу даследавання склалі навуковыя публікацыі, як айчынныя [1, 2, 3, 5, 6], так і замежныя [4, 7, 8], у якіх закранаюцца праблемы вывучэння керамікі з тэрыторыі Беларускага Панямоння. Падчас правядзення з імі працы прымяняліся агульнанавуковыя, спецыяльныя гістарычныя метады, а таксама метады, характэрныя для гістарыяграфічнага пазнання.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Асноўную ўвагу пры даследаванні керамікі супольнасцяў "ляснога неаліту" Беларускага Панямоння М.М. Чарняўскі звяртаў на наступныя асноўныя паказчыкі: марфалогію пасудзін, тэхналогію вытворчасці, а таксама арнаментацыю (тыповыя элементы і матывы аздаблення). М.М. Чарняўскі вылучыў 3 групы сярод знаходак керамікі, што і паслужыла падставай для перыядызацыі нёманскай культуры. У ёй даследчык вылучыў 3 храналагічныя этапы: ранні (дубічайскі),

Репозиторий ВГУ

сярэдні (лысагорскі) і позні (дабраборскі) [5, с. 47-67]. Сама канцэпцыя нёманскай культуры з цягам часу зведала пэўныя змяненні. М.М. Чарняўскі ўжо на рубяжы XXI стагоддзя прыйшоў да высновы аб магчымасці вылучэння ранняга этапу нёманскай культуры (дубічайскага) у якасці асобнай культуры – прыпяцка-нёманскай [6, с. 29]. Трэба заўважыць, што большасць высноў была зроблена даследчыкам на падставе праведзенай працы ў 1960–70-я гг. Таму на сённяшні дзень патрабуецца дадатковае вывучэнне керамікі пералічаных культур з выкарыстаннем дасягненняў сучаснай археалагічнай навукі.

В.Л. Лакіза засяродзіў свае даследаванні на старажытнасцях позняга неаліту-пачатку бронзавага веку Паўночна-Заходняй Беларусі. Археолаг галоўную ўвагу накіраваў на вывучэнне керамікі ў трох яе аспектах: тэхналогіі, марфалогіі і арнаментацыі. Значнай па сваёй навуковай вартасці з'яўляецца распрацоўка аўтарам сістэмы класіфікацыі элементаў арнаменту познанеалітычных пасудзін з тэрыторыі Беларускага Панямоння. Навуковец улічыў распрацаваную М.М. Крывальцэвічам схему ўніверсальнай класіфікацыі элементаў, якая базавалася на аналізе сінхроннай па часе керамікі з паселішча Азярное 1, што на Поўначы Палесся [2, с. 8-10, мал. 24]. В.Л. Лакіза ўзяў на ўвагу рэгіянальныя асаблівасці Беларускага Панямоння ў неаліце і прапанаваў асабісты погляд па дадзенаму пытанню. Археолаг вылучыў 11 тыпаў элементаў арнаменту (пазначаных літарамі ад А да Л). Сістэматызацыя таксама была праведзена навукоўцам і пры вывучэнні марфалогіі пасудзін [3, с. 96-98, мал. 36].

У выніку комплекснага даследавання познанеалітычнай керамікі В.Л. Лакіза вылучыў тры тыпы такіх артэфактаў сярод групы 1, якую ён звязаў са старажытнасцямі кола культур шнуравой керамікі. Кераміка тыпу 1 была аднесена археолагам да А-гарызонту згаданага культурнага асяродку. Характэрныя асаблівасці керамікі тыпу 2 і тыпу 3 сталі падставай для вылучэння даследчыкам на тэрыторыі Беларускага Панямоння новых таксонаў: помнікаў тыпу Бершты-Русакова і Падгорнаўскай групы помнікаў суадносна. В.Л. Лакіза ахарактарызаваў 4 асноўныя тыпы сярод матываў арнаментацыі керамікі групы 1 тыпу 2 і 6 асноўных тыпаў сярод матываў арнаментацыі керамікі групы 1 тыпу 3. Важным адрозненнем керамікі груп 1 тыпу 2 і тыпу 3 з'яўляюцца тэхналагічныя прыёмы вытворчасці [3, с. 102, мал. 38, 104, мал. 39, 146-155].

Перспектыўным у вывучэнні неалітычнай керамікі з'яўляецца падыход, выкарыстаны В.Л. Лакізам. Па першае, кераміка разглядалася археолагам па трох асноўных паказчыках з выкарыстаннем сістэматызацыі. Асабліва гэта тычыцца прапанаванай класіфікацыі элементаў і матываў арнаментацыі пасудзін, а таксама вывучэння тэхналагічных асаблівасцяў. Па другое, навуковец не спыняўся на разглядзе познанеалітычных старажытнасцяў Беларускага Панямоння ў рамках адной культуры. Спачатку ішоў разгляд керамічных артэфактаў, а потым на базе ўсебаковага аналізу праводзілася карэляцыя атрыманых дадзеных з ужо вядомымі і добра ахарактарызаванымі культурнымі асяродкамі. Такім чынам кераміка групы 1 тыпу 2 была звязана В.Л. Лакізам з жуцаўскай культурай, а кераміка групы 1 тыпу 3 з традыцыямі сярэднедняпроўскай культуры [3, с. 150, 153].

Неабходна згадаць і праведзеную А.У. Зуевай працу над старажытнасцямі культуры шарападобных амфар. Даследчыца ў першую чаргу на керамічным матэрыяле паказала ролю дадзенай культуры ў развіцці мясцовых познанеалітычных супольнасцяў [1, с. 11-12, 14-15].

Трэба таксама ўлічваць і распрацоўкі польскіх навукоўцаў Б. Юзвяка [7, s. 95-145] і Д. Манастэрскага [8, s. 30-81], якія ў сваіх працах вывучаюць тыя ж культурныя асяродкі, што прысутнічаюць і на тэрыторыі Беларускага Панямоння. У даследаваннях згаданых археолагаў асаблівую ўвагу звяртае на сябе добра сістэматызаваная праца з керамікай, як важнейшай крыніцай па вывучэнню неалітычных супольнасцяў той пары.

**Заключэнне.** Такім чынам, можна сфармуляваць наступныя перспектыўныя накірункі ў даследаванні неалітычнай керамікі Беларускага Панямоння. Пры вывучэнні керамікі "ляснога неаліту" неабходна пабудова дакладнай класіфікацыі элементаў і матываў аздаблення, а таксама марфалогіі посуду. За ўзор у выкананні дадзенай працы варта ўзяць згаданыя вышэй распрацоўкі В.Л. Лакізы і М.М. Крывальцэвіча. Трэба

Рэпазіторый ВДУ

працаваць больш уважліва, асабліва пры даследаванні тэхналогіі керамічнай вытворчасці, з улікам дасягненняў польскіх навукоўцаў. Перспектыўным з'яўляецца адыход ад разгляду "ляснога неаліту" разглядаемага рэгіёну ў рамках толькі прыпяцка-нёманскай і нёманскай культур. У сувязі з выяўленнем на пачатку XXI стагоддзя ў Паўднёвай Літве помнікаў са старажытнасцямі нарвенскай культуры [4, с. 153-154] карысным становіцца пошук прысутнасці традыцый дадзенага культурнага асяродку і на тэрыторыі Беларускага Панямоння.

*Спіс літаратуры*


1. Зуева, А.У. Культура шарападобных амфар на тэрыторыі Беларусі і яе роля ў развіцці супольнасцяў III – пачатку II тыс. да н.э.: аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.06 / А.У. Зуева. – Мінск, 2011. – 24 с.
2. Крывальцэвіч, М.М. Азярное 1 – паселішча эпохі бронзы на поўначы Палесся / М.М. Крывальцэвіч // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 1999. – Вып. 2. – 108 с.
3. Лакіза, В.Л. Старажатнасці позняга неаліту і ранняга перыяду бронзавага веку Беларускага Панямоння / В.Л. Лакіза. – Мінск: Беларуская навука, 2008. – 343 с.
4. Мартинкевичюте, Э. Нарвская культура в Южной Литве / Э. Мартинкевичюте // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2010. – Вып. 18. – С. 147–160.
5. Чарняўскі, М.М. Неаліт Беларускага Панямоння / М.М. Чарняўскі. – Мінск: "Навука і тэхніка", 1979. – 144 с.
6. Чарняўскі, М.М. Да пытання вылучэння прыпяцка-нёманскай ранненеалітычнай культуры / М.М. Чарняўскі // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Мінск, 2003. - №18. – С. 25–33.
7. Józwiak, B. Społesnosci subneolitu wschodnioeuropejskiego na Niżu Polskim w międzyrzeczu Odry i Wisły / B. Józwiak. – Poznań: Instytut Prahistorii Universytetu im. Adama Mickiewicza, 2003. – 449 s.
8. Manasterski, D. Pojezierze Mazurskie u schyłku neolitu i na początku epoki brązu w świetle zespołów typu Ząbie-Szestno / D. Manasterski. – Warszawa: Instytut Archeologii Uniwersytetu Warszawskiego, 2009. – 327 s.


# ПСИХОЛОГИЧЕСКИЕ АСПЕКТЫ ПРОТИВОРЕЧИЙ ВОСПРИЯТИЯ ЗАКОНОВ МИКРОЭКОНОМИКИ В ЭКОНОМИЧЕСКОЙ ЛИТЕРАТУРЕ


*В.А. Янчук*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*


Актуальность исследования состоит в том, что в белорусской учебной экономической литературе некоторые концепции западных экономистов воспринимаются без учета культуры их мышления, а в ряде случаев они значительно переоцениваются. Это обстоятельство не позволяет адекватно оценивать экономическую реальность и вырабатывать рекомендации по повышению эффективности деятельности субъектов микроэкономики.

Цель исследования – способствовать решению в Беларуси такой важнейшей задачи изучения микроэкономики, как формирование у специалистов народного хозяйства современного экономического мышления.

**Материал и методы.** Материалом исследования является белорусская учебная экономическая литература по разделу «микроэкономика», в частности, использовались источники, указанные в списке литературы. При этом в исследовании главным образом использовались методы функционального и предельного анализа.

**Результаты и их обсуждение**. В белорусской учебной экономической литературе описывается, например, *так называемый закон убывающей отдачи переменных факторов производства*. При этом убывание их отдачи считается универсальным законом. Так, белорусские авторы учебника по экономической теории по этому поводу пишут следующее: «Рационализация использования ресурсов в краткосрочном периоде деятельности фирмы как раз и выступает тем фактором, который позволяет увязать экономику фирмы с рыночной конъюнктурой. Данная увязка осуществляется на основе так называемого закона убывающей отдачи, который еще называется «законом убывающего предельного



Репозиторий ВГУ